## *Ермаковіч (дзяв. Казакевіч) Вера Пятроўна*

*13.07.1926, хутар Ціцін Смаргонскага р-на.*

У маі 1944г. Вера Пятроўна з іншымі аднавяскоўцамі была (адна з усёй сям'і) схоплена немцамі (СД) ў вёсцы Каты, Сінькаўскага сельсавета Вілейскага раёна за сувязі з партызанамі (у 1943-44гг. яна была сувязной партызанкай атрада імя Кутузава, перадавала патрэбныя рэчы, паперы, шыла маскхалаты). Яе 1 тыдзень дапытвалі ў Маладзечне (білі, але не прызналася, нікога не выдавала), трымалі 1 тыдзень у турме ў Вілейцы, затым у лагеры ў Мінску. З Мінску таварняком вязняў, у тым ліку Веру Пятроўну, павезлі ў канцлагер "Асвенцім" (Польшча) (прыбылі 23 мая 1944г.), які быў за калючым дротам пад токам. Тут ёй на руцэ выкалалі нумар 79825. Жылі вязні ў бараках. Іх ганялі на работы: капалі канавы, збіралі каменні, інш. Давалі есці баланду з рэдзькі, капусты, гароху. У студзені 1945 г. Вера Пятроўна была пераведзена ў канцлагер Берген-Бельзэн (Германія), з якога 15.04.1945 г. вязняў вызвалілі англічане.

Пасля вызвалення была дастаўлена ў Ваўкавыск, адкуль самастойна дабралася дамоў, на хутар Ціхін.

З Ціхіна выйшла замуж у в. Канюхі. Муж памёр у 1986 г. Дачка з сям'ёй жыве ў Маладзечне, сын на Ўкраіне.